УДК 821.161.3-14*М. Багдановіч

Г. У. Таргонская

Навук. кір. – А. В. Брадзіхіна, канд. філал. навук, дацэнт

МОДУСЫ ПЕРЦЭПЦЫІ Ў ЛІРЫЦЫ М. БАГДАНОВІЧА

У артыкуле разглядаюцца адметнасці выкарыстання модусаў перцэпцыі ў лірыцы М. Багдановіча. Модусы перцэпцыі з�much"яўляюцца адным са спосабаў адлюстравання эстэтычнай мадэлі свету пісьменніка. Зроблена выснова, што лірычны герой М. Багдановіча ўспрымае навакольную рэчаіснасць найперш праз зрок і слых, а таму візуальны і акустычны спосабы ўспрымання з‟яўляюцца асноўнымі модусамі перцэпцыі.

Спецыфіка стылю любога пісьменніка ў многім абумоўлена перцэптыўна-сэнсорнымі адчуваннямі, якія перадаюцца ў мастацкім тэксце. Мова як адзін з асноўных інструментаў пазнання, канцэптуалізацыі і катэгарызацыі навакольнага свету дапамагае чалавеку абагульніць усю інфармацыю, якая паступае праз зрок, слых, дотык, нюх, смак. Такім чынам фарміруюцца веды, набытыя ў выніку ўспрымання свету органамі пачуццяў чалавека (пачуццѐвы вопыт), побач з ведамі, атрыманымі шляхам рэчыўнай дзейнасці і аперацый розуму. «Пачуццѐвае ўспрыманне разглядаецца «ў якасці падмурка пазнавальнай дзейнасці, паколькі «кагніцыя ахоплівае любыя формы пазнання свету, а пачынаюцца яны з першых кантактаў чалавека з навакольным асяроддзем» [1, с. 10], – адзначае Е. Кубракова. Менавіта таму працэс адлюстравання ў мастацкім тэксце пачуццѐвага ўспрымання рэчаіснаці з‘яўляецца адным з асноўных складнікаў эстэтычнай мадэлі свету мастака слова. Зрокавае ўспрыманне кваліфікуецца як галоўны спосаб прасторавай арыентацыі, які ажыццяўляецца праз вочы чалавека. У іерархіі сэнсорных мадальнасцей, што грунтуецца на значнасці для якасці жыцця чалавека, зрокавае ўспрыманне займае галоўнае месца. У шырокім сэнсе ўсѐ, што звязана з апісаннем навакольнай рэчаіснасці ў тэксце, звязана і са зрокавым успрыманнем. У паэтычным творы найбольш выразна гэты модус перцэпцыі праступае праз колер і абрысы. Так, у вершы «Касцѐл Св. Анны ў Вільні» паэт адлюстроўвае ўзвышаныя рэлігійныя пачуцці праз зрокавыя вобразы, апісваючы касцѐл: Як лѐгка да гары, як красна Узносіць вежы ѐн свае! Іх зарыс стройны ў небе ясны Ізломам дзіўным устае. А вастрыя іх так высока, Так тонка ў вышу неба тнуць: Што міг – і ўжо, здаецца воку, Яны ў паветры паплывуць («Касцѐл Св. Анны ў Вільні») [2, с. 247]. Вобраз касцѐла, выпісаны вертыкальнымі лініямі, паўстае вельмі ўзнѐслым, бліжэйшым да Бога. Вочы «вымушаюць» паверыць у гэта, бо ўбачыць – значыць спазнаць: Глядзіш, – і ціхнуць сэрца раны, І забываеш долі глум. Прыйдзіце да касцѐла Анны, Литературоведение 110 Там знікне горач цяжкіх дум («Касцѐл Св. Анны ў Вільні») [2, с. 247]. Тут вера, зварот да рэлігіі дапамагаюць лірычнаму герою супакоіць чалавечыя пачуцці ў сваѐй свядомасці. Такім чынам, зварот у паэтычным тэксце да модусаў перцэпцыі дазваляе выявіць адметнасці светаўспрымання чалавека: Падымі угару сваѐ вока, І ты будзеш ізноў, як дзіця, І адыйдуць – адлынуць далѐка Усе трывогі зямнога жыцця («Падымі угару сваѐ вока…») [2, с. 74]. Праз погляд увысь паэт адлюстроўвае зварот лірычнага героя да Бога. Калі «падняць угару сваѐ вока», то можна спасцігнуць галоўнае, сваю душу, і ўсѐ астатняе не будзе здавацца такім значным. Па сутнасці, гэта адначасова і погляд унутр сябе. Цікава, што модусы перцэпцыі цесна звязаны с асацыяцыямі. Тое, што мы бачым, пакідае след у нашай памяці, калі звязваецца з нейкімі абставінамі і выклікае ўспаміны. Менавіта на такім прынцыпе пабудавана вобразнасць «Раманса» («Зорка Венера ўзышла над зямлѐю…») М. Багдановіча: Зорка Венера ўзышла над зямлѐю, Светлыя згадкі з сабой прывяла… Помніш, калі я спаткаўся з табою, Зорка Венера ўзышла («Раманс») [2, с. 77]. Момант зараджэння кахання ў лірычнага героя асацыіруецца з ўзыходам зоркі. Яна становіцца важнай дэталлю ў памяці, сімвалам кахання. Пры сузіранні яе закаханыя будуць успамінаць адно аднаго, нягледзячы на адлегласць, якая іх раздзяляе. Зорка будзе асацыіравацца з пераджытым пачуццѐм, якое надоўга захаваецца ў памяці: «Каб хоць на міг

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

уваскрэсла каханне, // Глянь іншы раз на яе…» [2, с. 77]. Модус перцэпцыі «слых» – таксама адзін з галоўных каналаў паступлення інфармацыі пра свет. Гукавыя вобразы ў паэтычным тэксце складаюцца з комплексу характарыстык і могуць быць інтэрпрэтаваны з розных пунктаў гледжання. У лірыцы М. Багдановіча гэты модус перцэпцыі прадстаўлены шырока: Заварожаны вячэрняй цішынѐй, Я не цямлю, дзе рука, дзе галава; Бачу я, з прыродай зліушыся душой, Як дрыжаць ад ветру зоркі нада мной, 111 Чую у цішы, як расце трава («Цѐплы вечар, ціхі вецер, свежы стог…») [2, с. 62]. Лірычны герой верша адчувае сябе часткай прыроды, зліваецца з ѐю, заўважае кожную дэталь. Ён бачыць, як «дрыжаць ад ветру зоркі», чуе, як «расце трава». І праз гэтыя няўлоўныя назіранні герой адчувае прыроду, спазнае яе, бачыць нешта большае, чым можа заўважыць звычайны чалавек праз органы пачуццяў. Пачуццѐвы вопыт адкрывае новыя далягляды такога простага, на першы погляд, але ўсѐ ж такі таемнага і складанага свету: Дзесь у хмарах жывуць павукі, Што снуюць павучыну дажджа. Кожны тлусты і мяккі такі, Скура слізкая, як у вужа; У целе стыгне халодная кроў, Злосць бясцэльная ў мутных вачах… Чуеш! Во шорах ног павукоў, Аплятаючых сцены і дах («Дзесь у хмарах жывуць павукі…») [2, с. 68]. Пісьменнік выкарыстоўвае нестандартную метафару, прыраўноўваючы кроплі дажджу да ног павукоў, дадаючы да акустычных тактыльныя адчуванні. І сапраўды, седзячы ў памяшканні, чалавек на слых высвятляе, што за акном ідзе дождж. А дэталі дотыкавага характару: «тлусты і мяккі», «скура слізкая, як у вужа», «стыгне халодная кроў» – выразна падкрэсліваюць пачуцці лірычнага героя і надаюць завершанасць карціне. Перад намі, відавочна, восеньская змрочная непагадзь, а ніяк не спорны летні лівень. У М. Багдановіча прырода часта праяўляецца праз катэгорыі «жывое» і «гучнае». Менавіта так у вершы «Маѐвая песня» паэт апісвае вясну, калі ўсѐ ажывае і ажыўляецца. Гукі прыроды паэт прыраўноўвае да песні. Здаецца, лірычны герой ловіць кожны шолах і пошум, якія ствараюць агульную поліфанічную карціну: Ці не вецер гэта звонкі У тонкіх зѐлках шапаціць? Або мо сухі, высокі Ля ракі чарот шуміць? [2, с. 75] Адносна рэдка паэт звяртаецца да альфактарных эфектаў. Так, у вершы «Дзве смерці» праз пахавыя вобразы ўвасабляецца смерць, якая асацыяцыіруецца з горкім пахам: Калі Патрыцый смерць з прыветам спатыкаў, Прабіўшы жылы на руках, Литературоведение 112 Дрыжэлі спевы флейт, дзень ясны дагараў, А праз вакно струѐю вецер павяваў І… мігдаловы горкі пах («Дзве смерці») [2, с. 103]. Такім чынам, модусы перцэпцыі дапамагаюць чалавеку больш поўна ўяўляць навакольны свет. М. Багдановіч у сваѐй лірыцы адводзіць значнае месца модусам перцэпцыі, і найперш зрокавым і акустычным эфектам. Альфактарныя і тактыльныя вобразы ў вершах паэта сустракаюцца спарадычна.

Спіс літаратуры 1 Кубрякова, Е. С. Об установках когнитивной науки и актуальных проблемах когнитивной лингвистики / Е. С. Кубрякова // Вопросы когнитивной лингвистики. – 2004. – №1 (001) – С. 6–17. 2 Багдановіч, М. А. Збор твораў: у 3-х т. / М. Багдановіч. Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – Мінск : Бел. навука, 2001. - 752 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ